# Весці

## Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс. Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

**№ 2(44) 2005**

**СЕРЫЯ 2.**
**Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія**

*Галоўны рэдактар:*
П. Дз. Кухарчык

*Рэдакцыйная калегія:*
Н. Г. Алоўнікава
В. А. Бондар
*(нам. галоўнага рэдактара)*
В. В. Бушчык
*(нам. галоўнага рэдактара)*
Ю. А. Быкадораў
*(нам. галоўнага рэдактара)*
А. М. Вітчанка
С. Я. Гайдукевіч
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
В. М. Дабранскі
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
І. В. Катляроў
П. В. Кікель
Н. І. Копысава
*(адказны сакратар)*
Г. А. Космач
Н. І. Кунгурава
І. Я. Левяш
А. М. Люты
У. А. Мельнік
І. А. Новік
В. М. Русак
А. І. Смолік
В. Дз. Старычонак
В. Б. Таранчук
І. С. Ташлыкоў
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
А. С. Цернавы
Л. Н. Ціханаў
І. І. Цыркун
М. Г. Ясавееў
М. С. Яўневіч

## Змест

***Гісторыя***

**Да 60-годдзя Вялікай Перамогі**

*Жылінскі М. Г.* Патрыятычная барацьба супраць германскіх агрэсараў на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны як адзін з вызначальных фактараў перамогі над ворагам ........ 3

*Касовіч А. В.* Антыгерманскі рух на тэрыторыі Беластоцкай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны ........ 8

*Канапацкі І. Б.* Удзел татараў у Вялікай Айчыннай вайне на тэрыторыі Беларусі ........ 12

*Новікаў С. Я.* Эканамічная палітыка германскіх акупантаў у Беларусі 1941—1944 гг. ........ 15

*Нікалаева І. У.* Выкарыстанне нямецкімі акупантамі працы жаночага насельніцтва Беларусі ў мясцовай вытворчасці і на прымусовых работах (1941—1944) ........ 28

*Вінніца Г. Р.* Халакост у Оршы ........ 31

*Шкуцько Л. Л., Канапацкі І. Б.* Брацкая дапамога народаў СССР беларускаму народу ў аднаўленні разбуранай гаспадаркі. 1943—1945 гг. ........ 34

✧ ✧ ✧

*Пуцік У. С.* Да пытання аб вытоках абмежавання ўплыву беларускай нацыянальна-дзяржаўнай ідэі на грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі на этапе капіталізму ........ 37

*Талкачоў В. І.* Трансфармацыя беларускай нацыянальнай дзяржаўнай ідэі ў дакументах беларускіх палітычных партый і працах нацыянальных дзеячаў ........ 39

*Жылінская І. У.* Саюз Вялікабрытаніі і СССР у грамадскай думцы Англіі напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны (1939—1941 гг.) ........ 43

*Багалейша С. В.* Польска-літоўскі канфлікт і Беларусь ........ 47

***Філасофія***

*Міхневіч А. А.* Пазіцыя асобы як агульная мэта фарміравання нацыянальнай самасвядомасці студэнта ........ 54

*Круглова Г. А.* НТР у асноўных канцэпцыях «хрысціянскай глабалістыкі» ........ 59

***Паліталогія***

*Землякоў Л. Я.* Палітычныя асновы патрыятызму і яго фарміраванне ў маладзёжным асяроддзі сучаснага беларускага грамадства ........ 65

*Зенчанка В. А., Паўлава Н. В., Сцяпанаў Г. І.* Праблемы фарміравання палітычнай культуры студэнцкай моладзі ва ўмовах станаўлення грамадзянскага грамадства ........ 68

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

лося б выжыць у той страшэннай вайне. З савецкага тылу партызаны атрымлівалі сродкі сувязі, медыкаменты, узбраенне і г. д. Толькі з лета 1942 па сакавік 1944 г. з-за лініі фронту было перапраўлена 80 тыс. вінтовак, аўтаматаў, кулямётаў, 100 млн патронаў да іх, 400 т узрыўчаткі. Савецкія ваенныя лётчыкі вывезлі з варожага тылу больш за 11 тыс. беларускіх дзяцей і параненых партызан.

За тры гады гераічнай барацьбы ў тыле ворага, з чэрвеня 1941 па ліпень 1944 г., патрыёты Беларусі нанеслі вялікі ўрон акупантам у тэхніцы і жывой сіле. Яны знішчылі, паранілі і ўзялі ў палон амаль паўмільёна гітлераўцаў і паліцэйскіх. Было пушчана пад адхон 11128 эшалонаў і 34 бронецягнікі, разгромлена 29 чыгуначных станцый, 948 гарнізонаў і штабоў, падарвана і спалена 18700 аўтамашын, 939 ваенных складоў, 819 чыгуначных і 4710 іншых мастоў, збіта 305 самалётаў, падбіта 1355 танкаў і бронемашын, захоплена вялікая колькасць трафеяў. Нездарма гітлераўскі намеснік у Беларусі В. Кубэ дакладваў у Берлін, што ў тыле арміі «Цэнтр» фактычна існуе другі фронт — партызанскі.

Партызанскі і падпольны рух супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Беларусі перарос ва ўсенародную барацьбу, стаў адлюстраваннем пачуцця савецкага патрыятызму, пацвердзіў справядлівы характар Вялікай Айчыннай вайны. Па сваіх маштабах партызанская і падпольная барацьба, а таксама масавае супраціўленне насельніцтва, шкодзілі ўсім пачынанням акупантаў у іх тыле, мелі стратэгічнае значэнне і зрабіліся адным з рашаючых фактараў разгрому варожага нашэсця.

Прайшло 60 гадоў пасля завяршэння Вялікай Айчыннай вайны, але і сёння яе боль адчуваецца ў сэрцах, адбіваецца на жыцці пакаленняў. Бессмяротны героі, што жыццём сваім абаранілі свабоду і незалежнасць нашай Бацькаўшчыны. Памяць аб усіх, хто не вярнуўся з фронту, хто загінуў, змагаючыся за зямлю сваіх бацькоў, свяшчэнна.

*Summary*

*The article touches upon the partisan movement and underground struggle against German aggressors on the occupied territory of Belarus during the Great Patrionic War. It shows the role of the Belarasian people in crushing of the German occupation.*

*УДК 947.084.8*

***А. В. Касовіч***

# АНТЫГЕРМАНСКІ РУХ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАСТОЦКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Заходняя Беларусь, у тым ліку Беластоцкая вобласць, — гэта тэрыторыя галоўнага перамяшчэння германскіх войск, месца сацыяльных праяў у адносінах да акупацыйнага рэжыму і «новага парадку»: ад стрыманасці, садзейнічання і актыўнага супрацоўніцтва да ўзброенага супраціўлення праціўніку. Тым больш, што германскія ўлады падтрымлівалі ў насельніцтва ілюзіі адноснай бяспекі ў выпадку адсутнасці супраціўлення, надзею на магчымасць прыстасавацца да жыцця ва ўмовах «новага ладу» [1, л. 136].

Асобную пазіцыю заняло польскае насельніцтва краю. У дакументах ЦК КП(б)Б падкрэслівалася, што падчас адступлення савецкіх войск з раёнаў пражывання польскага насельніцтва ў Заходняй Беларусі адзначаліся выпадкі абстрэлу адыходзячых часцей Чырвонай Арміі і работнікаў савецкіх органаў улады. Такія факты мелі месца ў Гродне і іншых гарадах. У архіўных крыніцах знаходзяцца сведчанні аб выпадках самасуду і даносаў палякаў на беларусаў, якія займалі напярэдадні вайны адказныя пасады, абвінавачаных у сімпатыях да камуністаў [2, л. 26, 37, 60].

Германскі прапагандысцкі апарат усяляк імкнуўся схіліць жыхароў захопленых раёнаў да супрацоўніцтва. Пры гэтым улічваліся асаблівасці развіцця заходнебеларускіх зямель, даволі моцны ўплыў польскага элемента, незадавальненне перадваеннай палітыкай Савецкай улады. Былі дазволены прыватны бізнес, медыцынская практыка, прыватнае валоданне кустарнымі прадпрыемствамі, майстэрнямі, лаўкамі; была праведзена зямельная рэформа. Заахвочвалася навучанне ў школах на польскай мове. Вуліцам населеных пунктаў вярталіся старыя, дасавецкія назвы [3, с. 54—55]. Палякам з улікам іх высокага адукацыйнага ўзроўню надавалася перавага пры прызначэнні на пасады ў органы тэрытарыяльнай адміністрацыі. У выніку гэтага ў руках палякаў у пачатковы перыяд вайны апынуліся мясцовая адміністрацыя, дапаможная палі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

цыя, лясніцтвы, чыгунка, пошта і будаўнічыя арганізацыі. Польскі даследчык Ю. Туронак адзначае, што «ў Беластоцкай акрузе амаль на ўсе адміністрацыйныя пасады, акрамя кіруючых, якія займалі немцы, прызначаліся палякі. Недахоп беларускіх кадраў вымусіў акупантаў шукаць апору ў польскім элеменце. Адміністрацыйны апарат Гродна быў выключна ў польскіх руках» [4, с. 53—54].

Неабходна падкрэсліць, што ўжо з першых дзён вайны мясцовае насельніцтва выступіла на абарону Айчыны. Адзнакай высокага патрыятычнага ўздыму быў факт стварэння знішчальных батальёнаў і атрадаў народнага апалчэння. Ужо ў першыя гадзіны вайны ў вёсцы Свят-Гурска Сапоцкінскага раёна Беластоцкай вобласці быў створаны атрад самаабароны, які налічваў 40 патрыётаў. Да апошняга змагаліся члены атрада самаабароны раённага цэнтра Дамброва, які ўзначальваў сакратар РК КП(б)Б М. П. Ганчароў. Народныя фарміраванні былі створаны ў Саколках і Гродне [5, с. 50, 52]. Дрэнна ўзброеныя, слаба навучаныя ваеннай справе патрыёты апалчэнскіх фарміраванняў былі вымушаны кампенсаваць пралікі савецкага камандавання масавай мужнасцю і самаахвярствам.

Архіўныя матэрыялы сведчаць, што ўжо летам 1941 г. на тэрыторыі вобласці ўзніклі першыя ачагі супраціўлення. Аднак гэта адбывалася стыхійна, аб'ядноўваліся воіны-акружэнцы і мясцовыя актывісты. Так, у канцы чэрвеня 1941 г. антыфашысцкая арганізацыя аформілася ў Беластоку. Яе ўзначаліў маёр Чырвонай Арміі Г. Дубашвілі [6, л. 51—52]. У Гродне адным з першых уключыліся ў барацьбу супраць захопнікаў К. Г. Васілюк, былы ўдзельнік рэвалюцыйнага руху ў буржуазна-памешчыцкай Польшчы, ваенны інжынер М. А. Волкаў. Падпольныя групы ўзніклі ў горадзе ўжо ў верасні 1941 г. на мясакамбінаце і чыгуначным вузле. Акрамя таго, у барацьбу супраць акупантаў летам 1941 г. уключыліся атрады пад кіраўніцтвам мясцовых патрыётаў: І. М. Болтрыка, І. А. Цімашэнкі, В. А. Аўдоніна, А. А. Патапава, былога члена КПЗБ В. А. Сытага. У прыватнасці, у Скідзельскім раёне ўзброеную барацьбу вяла партызанская група пад кіраўніцтвам А. А. Патапава і В. А. Сытага. Да восені 1941 г. партызанская група І. М. Болтрыка налічвала 25 мясцовых патрыётаў і ваеннаслужачых [7, с. 80].

Паражэнне германскіх войск пад Масквой істотным чынам паўплывала на актывізацыю антыфашысцкай барацьбы ў заходняй частцы Беларусі. Ідзе працэс яе кансалідацыі, устанаўлення сувязей і ўзаемадзеяння паміж падпольнымі арганізацыямі і партызанскім рухам.

Пачатак станаўлення антыфашысцкіх камітэтаў у Беластоцкай вобласці паклаў Брэсцкі «Камітэт барацьбы з нямецкімі акупантамі». Падабраныя ім арганізатары правялі значную работу па яднанні патрыятычных сіл. Першымі былі створаны раённыя антыфашысцкія камітэты ў Скідзельскім, Ваўкавыскім, Свіслацкім, Гайнаўскім і Гродзенскім раёнах. Галоўная роля ў іх стварэнні належала А. М. Мінічу, А. М. Дурэйку, Е. Гардзею, В. Прэдку і інш. Патрыёты распаўсюджвалі лістоўкі сярод насельніцтва, збіралі для партызанскіх атрадаў зброю, боепрыпасы і харчаванне, вялі разведку. Напрыклад, антыфашысцкая група вёскі Падзалукі Заблудаўскага раёна перадала партызанам пяць ручных кулямётаў, восем вінтовак, 50 гранат, 11 скрынак з патронамі. Антыфашысцкія групы Скідзельскага раёна здабылі 8 вінтовак, 100 гранат, 8 тыс. патронаў, радыёпрыёмнік. Антыфашысцкі камітэт Гродзенскага раёна ў лістападзе 1942 г. стварыў і ўзброіў партызанскі атрад [8, с. 301].

У пачатку 1942 г. у вёсцы Русінаўцы Скідзельскага раёна ў доме чыгуначнага служачага В. Г. Кавалевіча быў створаны Скідзельскі антыфашысцкі камітэт. У яго склад увайшлі былыя члены КПЗБ А. Ф. Маневіч, А. Я. Мажэйка, В. Г. Кавалевіч, камсамолец І. Шчасны, былы член КСМЗБ, чыгуначны рабочы В. Кізевіч. Падпольшчыкі спальвалі варожыя маёнткі і склады, грамілі паліцэйскія ўчасткі, збіралі зброю для партызан, распаўсюджвалі сярод насельніцтва лістоўкі. У пачатку верасня 1942 г. гітлераўцам удалося схапіць восем скідзельскіх патрыётаў-камсамольцаў. 13 верасня былі сагнаны жыхары горада і навакольных вёсак на плошчу г. Скідзеля, і ў іх прысутнасці падпольшчыкі былі публічна пакараны [9, л. 140].

Вырашальную ролю ва ўмацаванні антыфашысцкай барацьбы адыграў V Пленум ЦК КП(б)Б, які адбыўся ў канцы лютага 1943 г. у Маскве. Яго рашэнні абавязвалі партыйныя арганізацыі дабівацца далейшага пашырэння і арганізацыйнага ўмацавання партызанскага руху ва ўсіх без выключэння раёнах Беларусі. Пры гэтым асаблівая ўвага надавалася ўмацаванню падполля і партызанскага руху ў заходніх абласцях Беларусі [10, л.137]. У жніўні 1943 г. пачаў работу ў тыле ворага Беластоцкі абком КП(б)Б (сакратар В. Я. Самуцін). Да ліпеня 1944 г. у вобласці дзейнічалі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4 міжрайкомы і 9 райкомаў КП(б)Б [11, с. 176]. Расло і арганізацыйна ўзмацнялася камсамольска-маладзёжнае падполле. На момант уз'яднання з часцямі Чырвонай Арміі Беластоцкая абласная камсамольская арганізацыя складалася з 96 пярвічных камсамольскіх арганізацый партызанскіх фарміраванняў і 279 падпольных камсамольскіх арганізацый агульнай колькасцю 2626 чалавек [12, с. 65].

Па ініцыятыве Беластоцкага абкома партыі 28 лістапада 1943 г. быў створаны абласны антыфашысцкі камітэт на чале з Д. К. Сукачовым. У завяршальны перыяд акупацыі камітэт кіраваў дзейнасцю 10 раённых камітэтаў, якія ў сваіх шэрагах налічвалі больш за 4 тыс. антыфашыстаў. Толькі ў Гродзенскім, Скідзельскім, Ваўкавыскім і Свіслацкім раёнах пад кіраўніцтвам абласнога камітэта барацьбу з захопнікамі вялі 56 антыфашысцкіх арганізацый агульнай колькасцю 580 чалавек, а таксама 36 падпольных баявых груп [13, л. 46, 48, 183, 187].

Перавага праціўніка ў сродках узброенай барацьбы не дазваляла беластоцкім партызанам, як і іншым партызанскім фарміраванням заходніх абласцей Беларусі, да падыходу часцей Чырвонай Арміі весці працяглыя баі. Па магчымасці баявыя задачы яны імкнуліся вырашаць, не ўступаючы ў прамое сутыкненне з ворагам. Гэтаму асноўная ўвага надавалася правядзенню дыверсій на варожых камунікацыях. Толькі за кастрычнік — лістапад 1943 г. Беластоцкім злучэннем было падарвана 1095 рэек і пушчана пад адхон 10 эшалонаў. З 1 верасня 1943 г. па 15 ліпеня 1944 г. беластоцкія партызаны пусцілі пад адхон 416 нямецкіх эшалонаў, падарвалі 192 масты, знішчылі 457 км тэлеграфна-тэлефоннай сувязі, разграмілі 24 заводы і фабрыкі, 73 дробныя прадпрыемствы, 50 ваенных складоў праціўніка, 1 чыгуначную станцыю, 4 электрастанцыі. У выніку баёў і дыверсій праціўнік згубіў 19 тыс. салдат і афіцэраў забітымі, параненымі і палоннымі, 25 танкаў і бронемашын, 190 аўтамашын. У выглядзе трафеяў партызаны захапілі 19 мінамётаў, 51 кулямёт, 648 вінтовак, 62 аўтаматы, дзесяткі тысяч патронаў [14, л. 163—166].

Поспех баявой дзейнасці забяспечваўся высокім маральным духам і гераізмам асабовага складу партызанскіх фарміраванняў. Так, толькі па выніках рэйду-перадыслакацыі на захад больш за трэць асабовага складу (140 партызан) брыгады імя А. Неўскага Беластоцкага злучэння былі прадстаўлены камандаваннем да ўрадавых узнагарод. У перыяд баёў з карнікамі ў раёне Рускай пушчы малады камуніст Віктар Каўпак быў цяжка паранены. Таварышы неслі яго па балотах каля 60 км на руках. Па прыбыцці ў лагер партызану-герою была аказана медыцынская дапамога, і ён змог праз пэўны час зноў стаць у строй. 13 пушчаных пад адхон эшалонаў было на ўліку камсамольца-падрыўніка Мікалая Корбута. Не аднойчы рызыкуючы асабістым жыццём, ён мініраваў дарогу паблізу варожых гарнізонаў. Пасля адной з дыверсій яго цяжка паранілі германскія ахоўнікі. Але таварышы даставілі М. Корбута ў шпіталь, дзе яму было выратавана жыццё. Актыўна ўдзельнічалі ў баявых паходах дзяўчыны-партызанкі. 9 лютага 1944 г. гераічна загінула ў баі сакратар Гродзенскага ГК ЛКСМБ Вольга Саломава. Галіна Зверкунова ў перыяд рэйду баявой групы па Дзятлаўскім раёне здзейсніла дыверсію ў гонар Дня Чырвонай Арміі 23 лютага 1944 г., у выніку чаго быў спалены склад з зернем. Ордэнам Чырвонай Зоркі была ўзнагароджана медыцынская сястра брыгаднага шпіталя Вольга Шынгірэй. Яна вылечыла і вярнула ў строй 30 байцоў і камандзіраў [15, л. 79—80].

На станцыі Гродна самааддана дзейнічала дыверсійная група на чале з рабочым чыгуначнага вузла Д. І. Салаўёвым. Міны, якія трапілялі да іх з партызанскіх атрадаў, удзельнікі групы зашывалі ў чорную тканіну і падкідвалі кускі «вугалю» ў тэндэры паравозаў. Такім чынам была падарвана значная колькасць паравозаў, часцей за ўсё тыя, якія рухаліся ў напрамку да фронту, што выклікала прастоі на чыгунцы. Па заданні антыфашысцкага камітэта падпольшчыкі ўзарвалі ў Гродне два вагоны з авіяцыйнымі бомбамі. Выконваючы загад Беластоцкага абласнога антыфашысцкага камітэта, толькі ў Гродзенскім раёне ў канцы 1943 — пачатку 1944 г. падпольшчыкі і антыфашысты пусцілі пад адхон два вайсковыя эшалоны, спалілі чыгуначную станцыю, знішчылі сем кіламетраў тэлефонна-тэлеграфнай сувязі і распаўсюдзілі больш за 3 тыс. агітацыйных брашур і лістовак [8, с. 307].

Да пачатку вызвалення Беларусі ў Беластоцкай вобласці дзейнічала 5 партызанскіх брыгад і 7 асобных партызанскіх атрадаў агульнай колькасцю звыш 4 тыс. чалавек [8, с. 308]. Яны ўяўлялі добра арганізаваную і кіруемую ўзброеную сілу, якая назапасіла за тры гады барацьбы ў тыле ворага багаты вопыт вядзення баявых аперацый і дыверсій.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ